А.У. Белікава,
намеснік начальніка аддзела вучэбна-метадычнага забеспячэння павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# Аналіз і ўдасканаленне сістэмы атрымання работнікамі культуры дадатковай кваліфікацыі

Перападрыхтоўка кадраў адносіцца да дадатковай адукацыі дарослых і забяспечвае атрыманне новай кваліфікацыі адпаведнага профілю, задавальняе патрэбнасці работнікаў галіны ў прафесійным удасканаленні.

Адным з асноўных напрамкаў кадравай работы ўстаноў культуры павінна стаць комплексная ацэнка канкрэтнага спецыяліста як неабходная ўмова прадухілення памылак у адборы і рацыянальным выкарыстанні персаналу.

Пунктам 11 часткі першай артыкула 55 Працоўнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — ПК) вызначана, што пры арганізацыі працы работнікаў наймальнік абавязаны забяспечваць павышэнне кваліфікацыі ці перападрыхтоўку работнікаў у парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважаным ім органам [7].

Работнікам, якія праходзяць перападрыхтоўку, наймальнік абавязаны ствараць неабходныя ўмовы для сумяшчэння працы з навучаннем, прадастаўляць гарантыі, устаноўленыя ПК, калектыўным дагаворам, пагадненнем, працоўным дагаворам.

Прыведзеныя з ПК нормы дазваляюць сцвярджаць, што навучанне работнікаў дзякуючы перападрыхтоўцы з'яўляецца як абавязкам, так і правам наймальніка.

У частцы пятай пункта 9 Агульных палажэнняў Адзінага кваліфікацыйнага даведніка пасад служачых, зацверджаных пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 2 студзеня 2012 г. № 1, вызначана, што наяўнасць у служачага дыплома аб вышэйшай (сярэдняй спецыяльнай) адукацыі па спецыяльнасці, якая не адпавядае кваліфікацыйным патрабаванням, прадугледжвае, як правіла, неабходнасць асваення ім зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую (сярэднюю спецыяльную) адукацыю, у адпаведнасці з профілем (напрамкам) адукацыі, спецыяльнасцю, якія пазначаны ў раздзеле «Кваліфікацыйныя патрабаванні» [6].

Кіраўніцтва многіх устаноў культуры часам няўважліва ставіцца да магчымасці набыцця работнікамі прафесійных кампетэнцый, якія патрабуюцца для выканання функцый новага напрамку прафесійнай дзейнасці.

Гэта перашкаджае ўдасканаленню кампетэнцый спецыялістаў, атрыманню работнікамі дадатковай кваліфікацыі.

Інбелкульт у адпаведнасці з ліцэнзіяй на адукацыйную дзейнасць з 2011 г. паспяхова рэалізуе змест наступных праграм ДАД:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць *вышэйшую адукацыю*, па спецыяльнасцях:

1-23 02 71 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», кваліфікацыя «Бібліятэкар-бібліёграф» [2];

1-23 02 73 «Экскурсійна-масавая работа ў музеях» (у 2012 г. спецыяльнасць перайменавана ў «Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці») [3];

адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць *сярэднюю спецыяльную адукацыю*, па спецыяльнасцях:

2-23 02 71 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», кваліфікацыя «Бібліятэкар-бібліёграф» [4];

2-23 02 72 «Культурна-дасугавая дзейнасць», кваліфікацыя «Арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці» [5].

Тэрмін атрымання адукацыі пры засваенні зместу адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, у Інбелкульце складае 24 месяцы па завочнай форме атрымання адукацыі, пры засваенні зместу адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, — 9 месяцаў па завочнай форме атрымання адукацыі.

За перыяд 2011—2016 гг. атрымалі дыпломы аб перападрыхтоўцы па спецыяльнасцях:

на ўзроўні *вышэйшай адукацыі*:

1-23 02 71 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» з прысваеннем кваліфікацыі «Бібліятэкар-бібліёграф» — 102 чалавекі;

1-23 02 73 «Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці» з прысваеннем кваліфікацыі «Музеязнаўца» — 50 чалавек;

на ўзроўні *сярэдняй спецыяльнай адукацыі:*

2-23 02 71 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» з прысваеннем кваліфікацыі «Бібліятэкар-бібліёграф» — 86 чалавек;

2-23 02 72 «Культурна-дасугавая дзейнасць» з прысваеннем кваліфікацыі «Арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці» — 82 чалавекі.

Трэба адзначыць, што Інбелкульт з'яўляецца адзінай у Рэспубліцы Беларусь установай, што ажыццяўляе перападрыхтоўку кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, па спецыяльнасці 1-23 02 73 «Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці» і перападрыхтоўку кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, па спецыяльнасцях 2-23 02 71 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» і 2-23 02 72 «Культурна-дасугавая дзейнасць».

За перыяд з 2011 па 2016 г. у Інбелкульце засвоілі змест адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў на ўзроўні вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі 320 чалавек.





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важнай састаўляючай дзейнасці ў сістэме ДАД з'яўляецца стварэнне прагнозных паказчыкаў патрэбнасці ў перападрыхтоўцы кадраў на бліжэйшую перспектыву.

Пачынаючы з 2015 г. пры фарміраванні Плана на каляндарны год у Інбелкульце праводзіцца маніторынг патрэбнасці ў навучанні па адукацыйных праграмах перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў. Гэта дазваляе сфарміраваць кантынгент і колькасць работнікаў, якія маюць патрэбнасць у перападрыхтоўцы (па спецыяльнасцях) на наступны год.

Навучанне кіруючых работнікаў і спецыялістаў пры перападрыхтоўцы носіць комплексны характар, прычым дадаткова да традыцыйных праграм перападрыхтоўкі павінна развівацца сістэма падтрымкі самаадукацыі слухачоў.

У сістэму ДАД у адпаведнасці з патрабаваннямі часу ўносяцца прапановы па метадычных наваўвядзеннях, звязаныя з удасканаленнем сістэмы [1, с. 238—239]. Сістэма перападрыхтоўкі кадраў накіравана на павышэнне якасці навучання і сувязь атрыманых ведаў з практычнай дзейнасцю слухачоў. Уносяцца якасныя змены ў падрыхтоўку спецыялістаў, сярод якіх можна вылучыць: арыентацыю на максімальны ўлік асобасных здольнасцей і дзелавых якасцей слухачоў; узгадненне мэт і зместу праграм навучання з дзейнасцю спецыялістаў, арыентацыю на патрэбнасці практыкі; максімальнае выкарыстанне актыўных метадаў навучання, сеткавых тэхналогій для бесперапыннага прафесійнага навучання, дыстанцыйную падтрымку самаадукацыі слухачоў.

Сёння якасць зместу і ўзроўню арганізацыі спецыялістаў вызначаюць некалькі ключавых складнікаў, сярод якіх:

вучэбныя планы і праграмы;

якасць ведаў слухачоў;

прафесарска-выкладчыцкі састаў;

адукацыйныя тэхналогіі;

матэрыяльна-тэхнічнае і арганізацыйнае забеспячэнне.

Бягучымі задачамі ўдасканалення сістэмы перападрыхтоўкі кадраў на дадзеным этапе варта лічыць:

удасканаленне сістэмы адбору слухачоў для навучання;

правядзенне прафесійнага і псіхалагічнага тэсціравання;

узгадненне з патрэбнасцямі практыкі аб'ёмаў ведаў і зместу праграм пры навучанні кадраў;

выкарыстанне актыўных форм навучання;

прымяненне тэхналогій дыстанцыйнага навучання;

удасканаленне праграмных сродкаў, якія забяспечваюць навучанне слухачоў;

стварэнне баз практык і інавацыйных пляцовак;

ажыццяўленне параўнальных навуковых даследаванняў па ДАД сумесна з іншымі айчыннымі і замежнымі ўстановамі ДАД.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Лапцёнак, І.Б.* Перападрыхтоўка кадраў сферы культуры як перспектыўны кірунак рэалізацыі кадравай палітыкі / І.Б. Лапцёнак // Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці : Нацыянальная культура ў зменлівым свеце : матэрыялы IV Міжнар. завочнай навук.-практ. канф. (Мінск, 24 снежня 2015 г.) / ДУА «Інстытут культуры Беларусі»; рэдкал.: І.Б. Лапцёнак [і інш.]. — Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2015. — 295 с.
2. Образовательный стандарт Республики Беларусь. Переподготовка руководящих работников и специалистов, имеющих высшее образование. Специальность 1-23 02 71 «Библиотековедение и библиография» / С.В. Зыгмантович, А.А. Кушнеревич. — Минск : Мин-во обр. Респ. Беларусь, 2012. — 17 с.
3. Образовательный стандарт Республики Беларусь. Переподготовка руководящих работников и специалистов, имеющих высшее образование. Специальность 1-23 02 73 «Коммуникация в сфере музейной деятельности» / Е.А. Макарова, И.Б. Лаптёнок, А.Б. Сташкевич, А.А. Кушнеревич. — Минск : Мин-во обр. Респ. Беларусь, 2013. — 17 с.
4. Образовательный стандарт Республики Беларусь. Переподготовка руководящих работников и специалистов, имеющих среднее специальное образование. Специальность 2-23 02 71 «Библиотековедение и библиография» / С.В. Зыгмантович, А.А. Кушнеревич. — Минск : Мин-во обр. Респ. Беларусь, 2012. — 14 с.
5. Образовательный стандарт Республики Беларусь. Переподготовка руководящих работников и специалистов, имеющих среднее специальное образование. Специальность 2-23 02 72 «Культурно-досуговая деятельность» / Е.А. Макарова, А.А. Кушнеревич, 2012. — 14 с.
6. Пастанова Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 2 студзеня 2012 г. № 1 «Аб зацвярджэнні Агульных палажэнняў Адзінага кваліфікацыйнага даведніка пасад служачых» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : nttp:/ levonevski.net/pravo/norm2013/num06/d06278/ntml. — Дата доступу : 07.06.2016.
7. Працоўны Кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 г. № 296-З [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : nttp:/levonevski.org/kodeksby/tk/index.ntm. — Дата доступу : 07.06.2016.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ